# ВАРЫЯЦЫІ



СВЯТЛАНЫ ГУТКОЎСКАЙ

Народныя танцы выконваюцца (а значыць — жывуць!) ва ўсіх кутках нашай планеты: у краінах з розным палітычным ладам, узроўнем эканамічнага развіцця і пануючай рэлігіяй. Што вабіць у народных скоках перш за ўсё? Захоўваючы пластычную памяць цэлых пакаленняў, яны даюць выдатную магчымасць самавыяўлення сродкамі рухаў надзіва прыгожых, гарманічна з'яднаных з цудоўнай народнай музыкай. Ёсць і яшчэ адна прычына: той, хто танцуе, быццам ведае рэцэпт маладосці. Не станем аспрэчваць: кожны служка Тэрпсіхоры, незалежна ад таго, прафесіянал ён ці аматар, заўсёды выглядае маладзей за свае гады. Нягледзячы на багацце навамодных танцавальных напрамкаў, заўсёды нязменна вялікая колькасць дзяцей і дарослых, якія асвойваюць мудрасці менавіта народнай харэаграфіі.

У народнай танцавальнай творчасці беларусаў ёсць свае цікавыя выканальніцкія традыцыі, сфармаваўся адметны нацыянальны стыль. Але парадокс у тым, што беларусы сёння аддаюць перавагу танцам іншых народаў. Як на пачатку XX стагоддзя Еўропу і Амерыку ахапіла тангаманія, так у апошні час у модзе ірландскія, індыйскія і ўсходнія танцы. Менавіта ім, не на карысць беларускім, аддаюць перавагу ўдзельнікі разнастайных мастацкіх конкурсаў і фестываляў (што я ўвесь час назіраю як сябра журы). У дадатак па гэтых накірунках на зайздрасць рэгулярна ладзяцца творчыя спаборніцтвы на лепшае выкананне. Чаму нашы дзяўчаты (і гэта пацвярджае ўсюдыісная статыстыка) больш ахвотна запісваюцца ў шматлікія школы і студыі фламенка або танца жывата (бэлідэнс)? Каб увасобіць нацыянальны дух гэтых танцаў, патрэбна валодаць іншай (дарэчы, неўласцівай усходнім славянкам) пластыкай, іншым тэмпераментам. Мець, нарэшце, іншую ментальнасць. Магчыма, справа ў іх большай відовішчнасці? Ці нашых суайчынніц прыцягвае модная экзотыка? Або гэтыя танцы больш разрэкламаваныя? Можна толькі здагадвацца. Але пакуль мы актыўна засвойваем чужую харэаграфічную пластыку, нашы ўнікальныя народныя танцы могуць паступова знікнуць. Бо яны жывуць толькі да таго часу, пакуль выконваюцца. ■

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ